ШТО ВАРТА ВЕДАЦЬ ПРА ВІЧ 7

МАЛАРЫТЧАНІН ЗБІРАЕ ФОТАГІСТОРЫЮ ГОРАДА 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 СНЕЖНЯ 2018 г. СУБОТА № 232 (28848)

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«Сёння ў ЕАЭС няма абмежаванняў для таго, каб праводзіць узаемныя разлікі ў нацыянальнай валюце. Гэта пытанне, хутчэй, суб'ектаў гаспадарання, якія аддаюць перавагу той ці іншай валюце. Гэта эвалюцыйны працэс. Думаю, што нашы нацыянальныя валюты будуць займаць усё большую долю ва ўзаемных разліках. Гаворка ідзе аб замяшчэнні долара і еўра на карысць нацыянальных валют пры ўзаемных разліках у ЕАЭС. Рыхтуецца канцэпцыя, якая заклікана рэгламентаваць работу па стварэнні агульнага фінансавага рынку аб'яднання».

КАРАТКА

- **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені — кастрычніку 2018 года склаў Br5,24 млрд.**
- Беларусь і Расія ўзгаднілі ўсе пытанні па падрыхтоўцы пагаднення аб узаемным прызнанні віз.
- **Каложская царква адкрыецца ў абноўленым выглядзе ў сярэдзіне снежня.**

- Генетычныя тэсты на засваенне глютэну і лактозы пачалі праводзіць у Інстытуце генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
- **Выстаўка «Найлепшыя цацкі СССР» пачне працаваць 6 снежня ў Мінску ў Гасцёўні Уладзіслава Галубка.**

ISSN 1990 - 763X

ЛЁН ЛЮБІЦЬ ПАКЛОН

Вынікі чарговага візіту Прэзідэнта ў Оршу

Апошнім часам Орша пастаянна фігуруе не толькі ў выступленнях кіраўніка дзяржавы, але і ў зводках навін у цэлым. Зразумела, у выпадку паспяховага аднаўлення па аршанскім прыкладзе павінны пайсці і многія іншыя гарады краіны. Гэтым разам мэтай паездкі Аляксандра Лукашэнкі стала канкрэтная галіна — ільнаводства. Пра што гаварылі і да чаго прыйшлі? За ходам візіту прасачыў наш карэспандэнт.

Фота БелТА.

НЕ Ў ПОЎНУЮ СІЛУ

Спачатку Аляксандр Лукашэнка адправіўся на Аршанскі льнокамбінат. Яму было даложана аб сітуацыі ў галіне ў цэлым у свеце, а таксама аб лакальных поспехах і няўдачах. На думку беларускага лідара, Беларусі трэба вырошчваць больш лёну, а не закупляць за мяжой. Была пастаўлена канкрэтная задача: гэтая галіна на працягу трох гадоў павінна быць мінімум у два разы больш эфектыўнай.

СТАР. 2

Новае жыццё старых сцен

Фота БелТА.

Майстар ААТ «Белрэстаўрацыя» Уладзімір ВАЙЦАХОВІЧ і цясляр Васіль ТУРОК.

Да канца года ў Крэўскім замку адновяць і накрыюць чарапічным дахам паўночна-заходнюю сцяну, паведамілі ў Смаргонскім райвыканкаме. На гэтыя мэты з фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва сёлета было выдзелена каля 880 тысяч рублёў. Пазней праект адкарэктавалі: на работы па кансервацыі і аднаўленні фрагментаў Крэўскага замка на 2018 год было накіравана каля 1,05 мільёна рублёў. Ужо зараз аб'ект карыстаецца папулярнасцю ў турыстаў: у выхадныя сюды заязджае па некалькі аўтобусаў. У далейшым пасля паэтапнай рэалізацыі праекта паток турыстаў, у тым ліку і замежных, узрасце.

Малая радзіма

ФАБРЫКА ЎРАЖАННЯЎ:

Новыя трэнды ў аграэкатурызме

Сёння ў Беларусі зарэгістравана больш за 2300 сядзіб, і гэтая галіна прыцягвае прырастаць новымі суб'ектамі. Нават калі хтосьці сыходзіць з рынку, яго месца займаюць новыя гаспадары. І хоць аграсядзібы прымаюць не такі вялікі працэнт турыстаў у параўнанні з гасцініцамі, базамі адпачынку, санаторыямі і іншымі традыцыйнымі месцамі размяшчэння, менавіта гэты сегмент працуе на імідж краіны. Апошнія два гады Беларусь адзначаецца як адна з найлепшых краін для аграэкатурызму па версіі National Geographic.

БЫЛО, ЁСЦЬ...

Не будзем забывацца пры гэтым, што прымаць гасцей на вёсцы наша краіна пачала не так даўно. Яшчэ ў 2002 годзе агратурысту нават не было дзе спыніцца на начлег, было праблематычна знайсці жытло з нармальным санвузлом. Калі пачала прырастаць інфраструктура, паўстала новае пытанне: чым турысту заняцца ў вёсцы? Але і такая праблема аказалася вырашальнай — тут гаспадароў аграсядзіб падтрымалі мясцовыя ўлады, работнікі культуры. Дзякуючы агратурызму пачалі ажываць вёскі, народныя калектывы атрымалі слухачоў, сталі запатрабаванымі рамёствы, школьнікі пачалі збіраць інфармацыю пра традыцыі ў сваіх населеных пунктах. Напрыклад, рэцэпты, якія адшукалі вучні Зэльвеншчыны нават патрапілі ў друк, і стравы, згатаваныя па іх, сёння турысты могуць замовіць у мясцовых пунктах харчавання.

Ды і самі гаспадары аграсядзіб пачалі ствараць разнастайныя турпрадукты. Сёння яны ўпэўнена заяўляюць: «Мы прадаём не столькі начлег і ежу, колькі ўражанні». Фестывалі, майстар-класы, конныя паходы і сплавы на плытах і байдарках, крэатыўныя музеі, спартыўныя забавы, квэсты і пазнавальныя сустрэчы — пералічваць варыянты актыўнага адпачынку, якія сёння прапануюць на вёсках, можна доўга.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

ЛЁН ЛЮБІЦЬ ПАКЛОН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Безумоўна, не абышлося без крытыкі: Прэзідэнт звярнуў увагу на недастатковыя аб'ёмы айчыннай ільняной сыравіны, а таксама на яе якасць. На Аршанскім ільнокамбінаце трэць магутнасцяў не ўдаецца загрузіць.

Віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы заявіў, што на планы па лёне ў 2018 годзе паўплывалі неспрыяльныя ўмовы надвор'я, аднак Аляксандр Лукашэнка быў непахісны: ёсць недапрацоўкі, якія не выпраўлены, трэба не толькі аб дзяржзаказе думаць, але і аб эфектыўнай вытворчасці.

Кіраўніку дзяржавы паказалі мадэрнізаваныя цэхі, прадэманстравалі магчымасці камбіната і прадукцыю. Дарэчы, у прадпрыемства расце выручка і зарплаты, выконваюцца крэдытныя абавязацельствы.

У завяршэнні наведвання завода Прэзідэнт адзначыў, што паколькі на галіну была зроблена стаўка, укладзена нямала сродкаў, трэба паглыбляцца, пашыраць лінейку тавараў, якія вырабляюцца.

СЭНС СПРАЧАЦЦА?

Далей адбылася нарада па развіцці льнаводства і перапрацоўцы лёну.

Прэзідэнт нагадаў, што рашэнне займацца льном было прынятае даўно, сёння позна спрачацца, ці правільна гэта. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ён лічыў, лічыць, а зараз і ўсе пераканаліся, што зрабілі правільна.

Беларускі лідар расказаў, што раней Францыя, Кітай, Расія і іншыя краіны ў дробных маштабах займаліся вырошчваннем лёну. Тады Беларусь была на 6—7 месцы. Пры гэтым ён падкрэсліў: што датычыцца перапрацоўкі і вытворчасці тканін, Беларусь заўсёды была на вышыні.

Зараз Беларусь апынулася на другім месцы па лёне. Францыя якасна працуе, Кітай згарнуў вытворчасць, паколькі ім не хапае пасяўных зямель, ім не да лёну, яны закупляюць валакно і ў нас. Расія працуе, але льнаводства там таксама скарачаецца.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, людзі ўсё больш схіляюцца да карыснага і натуральнага. Лён для краін, якія пацярпелі ад чарнобыльскай трагедыі, — гэта лекі, ільняныя тканіны — выратаванне, што ўсвядомілі і ў Еўропе. «А вытворцаў колькасць памяншаецца. Дык правільна мы зрабілі ці не?» — пацікавіўся ён у прысутных.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: стаўленне да лёну — абуральнае.

«Праходзячы па гэтых цэхах, кіраўнік прадпрыемства проста абмовіўся: вось кароткае валакно, вось гэтае зрабілі, тое зрабілі. Выдатныя тканіны робяць з кароткага льновалакна, мы іх бачылі. Але гэта ўсяго 30—35 % ён перапрацаваў. А астатнія 65—70 % дзе? Спакаваў, кудысьці адправіў, нешта сам зрабіў. Сёння 60—70 % кароткага льновалакна не даюць таго даходу, той эфектыўнасці і прыбытку, якую мы маглі б мець», — канстатаваў ён.

ВЫРАШАЦЬ, А НЕ ЧАКАЦЬ

Прэзідэнт адзначыў, што нараду па лёне адкладалі, напэўна, на працягу года.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз паўтарыў: увага да гэтай тэмы не выпадковая. Лён — гэта адзіны штогод узнаўляльны від сыравіны для тэкстыльнай прамысловасці. Нашы прадпрыемствы выпускаюць спецыялізаваную тэхніку для яго вырошчвання і ўборкі, тады як заводы асвойваюць і развіваюць новыя кірункі выкарыстання льновалакна, кастрыцы і льнасемя.

Зараз у нас аднаўляецца такая, здавалася б, згубленая пазіцыя, як вытворчасць ільнянога алею. Некалькі гадоў таму наша краіна цалкам яго імпартавала.

У краіне вызначыліся з тэхналогіяй вырошчвання, аптымальнымі тэрмінамі сяўбы і ўборкі гэтай сельскагаспадарчай культуры, вызначыліся з работай адпаведных прадпрыемстваў, але разам з тым сітуацыя ў галіны — не радасная. Маленькі прырост ёсць, дынаміка ў патрэбным кірунку. «Але гэта ж слёзы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўніка дзяржавы насцярожыла, што на нарадах, прысвечаных гэтай тэме, рэгулярна абмяркоўваюцца адны і тыя ж пытанні. «Праблемы ёсць як у вытворцаў лёну, так і ў яго перапрацоўшчыкаў. Аднак эфектыўных рашэнняў не прапаноўваюць ні губернатары, ні ўрад», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы паставіў перад удзельнікамі нарады наступныя пытанні: чаму па-ранейшаму не выконваюцца рэгламенты па падборы глеб і іх апрацоўцы? Што перашкаджае сеяць лён і падымаць ільнотрасту ў агратэхнічныя тэрміны? Чаму для закладкі таварных пасеваў выкарыстоўваецца насенне ніжэй трэцяй рэпрадукцыі?

Далей: якая работа праведзена ў краіне па стварэнні машын для ўсяго тэхналагічнага цыкла? Чаму ў ільнасеяльных арганізацый дагэтуль няма неабходнай тэхнікі для вырошчвання і ўборкі лёну?

Акрамя таго, што перашкаджае поўнай загрузцы вытворчых магутнасцяў нашых льнозаводаў?

Чаму яны працуюць неэфектыўна, а іх мадэрнізацыя звялася да банальнай замены зношаных вузлоў і агрэгатаў? У чым прычына адсутнасці якаснага льновалакна ў неабходным аб'ёме і невыканання дзяржзаказу?

Задача нарады была такой: аб'ектыўна вызначыць праблемныя пытанні з тым, каб вывесці, нарэшце, льняную галіну на эфектыўны ўзровень работы.

ЧАС АДКАЗВАЦЬ

Падчас нарады кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу прысутных на жорсткіх мерах у выпадку невыканання тэхналогій вырошчвання лёну.

На гэты аспект звярнуў увагу дырэктар РУП «Інстытут лёну» Іван Голуб. Гэта значыць, мае месца адыход ад рэкамендацый навукоўцаў і спецыялістаў у гэтай сферы, што наўпрост уплывае на ўраджайнасць.

Прэзідэнт заявіў наступнае: калі ў 2019 годзе АПК і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі не пракантралююць выкананне тэхналогій пры вырошчванні лёну, то будуць прыняты самыя жорсткія меры. Практычная работа на месцах — зона адказнасці губернатараў.

Яшчэ беларускі лідар адзначыў, што ўсіх кіраўнікоў, якія добра працуюць па важных пытаннях і кірунках, трэба падтрымліваць. Не толькі ордэнам, але і яшчэ чымсьці.

ТЭХНІЧНЫ БОК ПЫТАННЯ

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў — ніякага імпарту, неабходна арганізаваць на айчынных прамысловых прадпрыемствах выпуск усёй наменклатуры неабходных запасных частак для рамонту тэхнікі.

«Ужо цяпер збярыце заказы, дапусцім, з ільнокамбіната. Аж да стварэння цэхаў па імпартазамяшчэнні ў той жа Оршы. Усё мы павінны рабіць у сябе, бо будуць вазіць з-за мяжы», — сказаў Прэзідэнт.

Чаму возяць цяпер? Беларускі лідар адказаў: таму што там адкаты, так званыя камісійныя — 8—15 %. Кіраўнік дзяржавы анансаваў, што днямі будзе расказана «яшчэ адна эпапея». Так, некалькі дзясяткаў кіраўнікоў папаліся на гэтым самым імпарце, людзі ўжо затрыманы.

Ён заявіў, што вытворчасць некаторых дэталяў можна даручыць айчынным прадпрыемствам — напрыклад МТЗ, «Гомсельмашу». Дарэчы, гэта датычыцца не толькі тэхнікі для льнаперапрацоўкі. Таксама Прэзідэнт паставіў задачу больш шырока выкарыстоўваць айчынныя тканіны на швейных прадпрыемствах, у тым ліку камвольных і льняных.

ПРА КІРАЎНІЦТВА

Дарэчы, падчас нарады кіраўнік дзяржавы расказаў, чаму Міхаіл Русы захаваў свой пост. Паводле яго слоў, на адным з сайтаў напісалі, што, напэўна, з Русым будуць разбірацца па выніках года. «Абсалютна правільна. І Русага з сённяшняга дня б не было, але як чалавек вясковы я разумею: быў усё ж такі не лепшы год. Справа не ў надвор'і, але быў далёка не лепшы год», — канстатаваў ён.

Беларускі лідар зноў звярнуў увагу на залежнасць дзеянняў кіраўніцтва і вынікі: калі б губернатары аддавалі таму ж ільнаводству большую ўвагу, эфектыўнасць была б вышэйшая. Прэзідэнт папярэдзіў: Міхаілу Русаму і міністру сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніду Зайцу трэба вырашыць гэтае пытанне ў 2019 годзе.

УВАГА — ЭКСПЕРЫМЕНТ!

Кіраўнік дзяржавы даў на нарадзе цікавае даручэнне губернатарам. Сутнасць такая: кожны з іх бярэ зямлю, якую дзеліць на тры часткі. Частку пры гэтым засеюць імпартным насеннем лёну, а іншыя — рознымі айчыннымі. Аднак загадана пры гэтым цалкам выканаць усе тэхналогіі. Калі кіраўнік дзяржавы наведае тую ці іншую вобласць, глядзець, што атрымалася, будуць менавіта на гэтых палях.

Дарэчы, падчас візіту Прэзідэнта было сказана пра тое, што беларускія сарты насення лёну лепш за замежныя.

ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

На нарадзе ўважліва разгледзелі ўсе этапы вырошчвання, вытворчасці і перапрацоўкі лёну. Як адзначыў Міхаіл Русы, распрацаваны доўгатэрміновы механізм выдзялення зямельных плошчаў для вырошчвання лёну-даўгунцу, прыняты неабходныя кадравыя рашэнні, вызначаны сыравінныя зоны для вырошчвання лёну і комплекс машын, атрыманы новыя раяніраваныя высокаэфектыўныя сарты.

Падрабязна на нарадзе разглядалася пытанне навуковага забеспячэння ў льнаводстве. Таксама казалі пра льнонасенстанцыі — іх колькасць павінна быць засяроджана, распыляцца не трэба.

Было даложана аб стварэнні машын для перапрацоўкі лёну. На парадку дня ў тым ліку кааперацыя з вядомым бельгійскім вытворцам падобнай тэхнікі. Даручэнне атрымаў і прамысловы сектар: максімальна забяспечыць аграрыяў, і не толькі дэталямі для рамонту тэхнікі, якія пакуль не вырабляюцца ў Беларусі.

Што яшчэ абмеркавалі? Закупачныя цэны на льновалакно, авансаванне, забеспячэнне захаванасці ўраджаю льнотрасты і атрыманай з яе сыравіны, і, зноў жа, паглыбленую перапрацоўку ільняной сыравіны, атрыманне шырокага спектру новай запатрабаванай у Беларусі і за мяжой прадукцыі.

«Рыса падведзена», — заявіў беларускі лідар у заключэнне.

Паводле яго слоў, кіраўнікоў рознага ўзроўню ратуе толькі тое, што ёсць дынаміка ў льнаводчай галіне мінімальна станоўчая, перш за ўсё дзякуючы Аршанскаму льнокамбінату, які стаў больш якасна працаваць. Безумоўна, няпросты год быў і па ўмовах надвор'я.

«Гэта вас ратуе. Усё. Адступаць няма куды», — канстатаваў ён.

Беларускі лідар дадаў, што нарада важная нават не дэталямі, у якія паглыбіліся. Добра, што губернатары, паколькі ім жа гэта рэалізоўваць, пачулі вастрыню гэтага пытання.

Але галоўнай Прэзідэнт назваў адказнасць, таму сам па сабе важны факт таго, што ўдалося сабрацца і яшчэ раз, жорстка пагаварыўшы, вызначыцца.

Прэзідэнт заклікаў прысутных не даводзіць сітуацыю да абсурду. Ён даручыў давесці ўсе заданні кожнай вобласці, колькі і дзе сеяць, каб потым прадаць патрэбную колькасць валакна.

Абмеркавалі і іншыя пытанні, звязаныя з Оршай.

Беларускі лідар падкрэсліў: Орша — гэта маяк, горад, у якім адпрацоўваюцца тэхналогіі, а пазней вопыт плануецца перадаць і іншым гарадам.

«Да канца 2020 года мы павінны забыць пра Оршу — у добрым сэнсе слова, — заявіў ён. — Таму туды, у новую пяцігодку, цягнуць ні ў якім разе нельга».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,
г. Орша.

Парламенцкі дзённік

ВЯЗАЦЬ ВЕНІКІ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

Савет Рэспублікі ўхваліў законапраект, які спросціць для насельніцтва нарыхтоўку дроў і галін

Учора на чарговым пасяджэнні пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання сенатары ўхвалілі змяненні і дапаўненні ў Лясны кодэкс.

У прыватнасці, прапануецца ўпарадкаваць выдзяленне ўчасткаў ляснога фонду для нарыхтоўкі драўніны на корані як фізічным, так і юрыдычным асобам пры правядзенні іншых высечак. «Зараз гэта досыць праблематычна ў сувязі з неабходнасцю ўнясення змяненняў у лесаўпарадкавальны праект, — растлумачыў журналістам **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Валянцін ШАТРАЎКА.** — Пасля змянення заканадаўства гэта будзе не патрэбна, рашэнне будзе прымацца юрыдычнай асобай, каб насельніцтва магло нарыхтоўваць сабе дровы ў лесе больш проста».

Першы намеснік міністра растлумачыў, што цяпер дзеля атрымання такога дазволу дастаткова будзе звярнуцца ў лясніцтва, і пытанне вырашыцца на працягу максімум двух дзён.

Таксама прапануюцца змяненні ў сувязі з адсутнасцю ў заканадаўстве азначэння «найважнейшыя інвестыцыйныя аб'екты». Гэта важна пры ажыццяўленні арэнды ляснога фонду дрэваперапрацоўчымі арганізацыямі. Прапануецца дэлегаваць Савету Міністраў права вызначаць крытэрыі выдзялення гэтых участкаў і дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы, якія маюць права атрымаць іх у арэнду. Гэта таксама ўпарадкуе сітуацыю, бо апошнім часам назіраецца пэўная дыспрапорцыя ў выдзяленні такіх участкаў, заўважыў Валянцін Шатраўка.

Акрамя таго, праект закона ўзмацняе адказнасць юрыдычных асоб, якім участкі ляснога фонду даюцца ў арэнду. «Справа ў тым, што юрыдычныя асобы не ўвесь аб'ём драўніны нарыхтоўваюць на гэтых участках, — растлумачыў першы намеснік міністра. — Прапануецца ўнесці таксавы кошт драўніны на корані за ўвесь аб'ём драўніны».

Яшчэ адна норма спрашчае для насельніцтва працэдуру доступу для нарыхтоўкі галін для выкарыстання ў рамесніцкай і прадпрымальніцкай дзейнасці.

Закон уступіць у сілу праз тры месяцы пасля падпісання кіраўніком дзяржавы. Чакаецца, што гэта адбудзецца ў сярэдзіне сакавіка.

Усяго на гэтым пасяджэнні сесіі члены Савета Рэспублікі разгледзелі восем законапраектаў, у тым ліку змяненні ў законы «Аб раслінным свеце», «Аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці», змяненні ў некаторыя законы па пытаннях прававой аховы тапалогій інтэгральных мікрасхем і шэраг ратыфікацый міжнародных дакументаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Прымайце віншаванні

СТАГАДОВЫЯ ЮБІЛЕІ ВЫДАННЯЎ

У Магілёўскай вобласці адразу тры газеты дасягнулі саліднага ўзросту

Шматлікія віншаванні ў гэтыя дні прымае галоўная газета горада на Бярэзіне «Бабруйскае жыццё». Першы яе нумар выйшаў сто гадоў таму 28 лістапада, праўда, тады яна называлася «Весці». На працягу свайго існавання газета неаднаразова змяняла назвы, адно заставалася нязменным: у яе рэдакцыі заўсёды працавалі сапраўдныя майстры слова, сярод якіх беларускія пісьменнікі і паэты Барыс Мікуліч, Пімен Панчанка, Міхась Лынькоў, Васіль Вітка, нарысіст Мікалай Валатковіч. За апошнія некалькі гадоў яна, дзякуючы таленавітаму журналісту і кіраўніку Вадзіму ШЧАГЛОВУ, стала больш насычанай і сучаснай, у яе з'явіліся дадатковыя інфармацыйныя пляцоўкі — абноўлены сайт «Bobrlife» (летась ён быў адзначаны гран-пры нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара»), радыё Зефір-FM, поўнафарматны тэлеканал «Бабруйск 360». Зараз былы кіраўнік працуе першым намеснікам генеральнага дырэктара тэлекампаніі «СТБ». Сёлета бабруйскі медыяхолдынг узначаліў вопытны **тэлежурналіст Уладзімір СЁМКІН.** У размове з карэспандэнтам «Звязды» ён прызнаўся, што яму вельмі імпануе работа ў такім ганаровым выданні і з такім творчым калектывам. Ён па-добраму ўражаны і тым духам, які пануе ў Бабруйску, і тым, як гараджане самаадданa любяць сваю малую радзіму і газету.

У апошні дзень лістапада сто гадоў спаўняецца мсціслаўскай раённай газеце «Святло Кастрычніка». Сёлета яна запусціла новы сайт mstlife.by, дзе ёсць версія і для слабавідушчых людзей.

— За апошнія тры гады мы істотна змянілі дызайн газеты: яна стала больш чытэльнай за кошт новай вёрсткі, з'явіліся новыя рубрыкі, суботні нумар павялічыўся на чатыры старонкі, папулярызуем сябе праз сацыяльныя сеткі — усё гэта дадае нам новых чытачоў. Мы зацікаўлены дайсці да кожнага чалавека, як гэта рабілі і нашы папярэднікі, — кажа **галоўны рэдактар раёнкі Міхаіл БУКІНІЧ.**

У рамках святкавання юбілею ў Мсціславе прайшлі літаратурныя чытанні, а таксама турнір па міні-футболе на кубак раённай газеты.

У снежні адзначыць свой стагадовы юбілей раённая газета Быхава «Маяк Прыдняпроўя». Яе **галоўны рэдактар Таццяна ЗАРЭМБА** на пасадзе кіраўніка зусім нядаўна, але ўжо жыве будучым газеты, думае, як стане з калегамі яе развіваць і папулярызаваць.

— За апошні час вельмі змяніўся знешні выгляд выдання, яно стала каляровым. Сёння мы робім стаўку на аператыўнасць, актыўна прасоўваем сябе праз сайт і сацыяльныя сеткі, — адзначыла суразмоўніца. Шмат сіл уклаў у газету яе былы рэдактар Мікалай Леўчанка — пісьменнік, заслужаны журналіст Беларусі. Ён тры гады як на пенсіі, але для маладога пакалення журналістаў застаецца прыкладам у рабоце і мудрым настаўнікам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Я выбіраю «Звязду»

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

«Газета дапамагла вывучыць родную мову»

Таццяна Краўцова, хатняя гаспадыня, г. Мінск.

— Я нарадзілася ў вёсцы, але родную мову ведала не надта добра — размаўляла на трасянцы. Аднойчы ў тралейбусе пачула, як хлопец з дзяўчынай размаўлялі чыста па-беларуску. А пасажыры вакол прыслухоўваліся да іх гаворкі і прыязна ўсміхаліся. «Якая ж прыгожая наша мова. А мы яе ігнаруем!» — уздыхнула побач жанчына. Гэта прымусіла мяне задумацца: чаму мы не карыстаемся матчынай мовай у побыце, і ўзяцца за яе вывучэнне. Пачала чытаць кнігі на беларускай мове. Знаёмыя падказалі выпісаць «Звязду». І ўжо каторы год я сябрую з вашай газетай. Мне падабаецца, што яна выдаецца на роднай мове, вучыць людзей шанаваць і берагчы роднае слова. Вельмі падабаецца рубрыка «Гаворым па-беларуску». Запамінаю незнаёмыя словы, а потым агучваю дзецям, мужу, сваякам, сябрам. Яны не заўсёды разумеюць іх сэнс. А калі тлумачу, то здзіўляюцца, як ёмка і дакладна можна ахарактарызаваць адным словам з'яву, падзею ці характар чалавека.

Падабаецца мне і «Алё, народ на провадзе». Якія ў нас жартаўлівыя, дасціпныя, з гумарам людзі! Захапляюць гісторыі, сцэны з вясковага жыцця — хоць кіно здымай!

Акрамя таго, я люблю працаваць на зямлі. Таму ў доглядзе за раслінамі вельмі дапамагае рубрыка «Сад і агарод». І наогул, чытаю матэрыялы ўсіх аўтараў. Мне здаецца, што ў рэдакцыі працуюць асаблівыя, адданыя прафесіі і нашай беларускай мове людзі.

Фестывалім!

«ПЕРАЕХАЛА КАМБАЙНАМ», або «Мы з 90-х»

Фестываль клуба вясёлых і знаходлівых на Кубак губернатара Мінскай вобласці адбыўся ў Салігорску. Тэмай гульні стаў заклік «Minsk Region check-in» або, як кажа сучасная моладзь, «зачыкіньcя ў Мінскай вобласці».

Упершыню мерапрыемства прайшло ў адкрытым фармаце, а за галоўны прыз змагаліся 26 камандаў не толькі з цэнтральнага рэгіёна, але і з розных куткоў Беларусі.

Удзельнікі паказалі свае таленты ў конкурсе «Фрыстайл», а таксама трапнасць, спрыт у конкурсе «Біятлон». Вызначальнымі крытэрыямі пры адборы пераможцаў сталі раскрыццё тэмы фестывалю, гумар, удачныя знаходкі і крэатыўныя рашэнні, артыстызм і мастацкае афармленне выступлення.

Вёў мерапрыемства спявак, тэлевядучы, а ў мінулым удзельнік клуба вясёлых і знаходлівых Георгій Калдун. Галоўны рэдактар фестывалю — Аляксей Святлоў — галоўны рэдактар Прэм'ер-лігі КВЗ Мінска і PR-менеджар тэлевізійнай міжнароднай лігі міжнароднага саюза КВЗ. У склад журы ўваходзілі прафесіяналы — тыя, хто сёння гуляе ў Клубе або гуляў раней.

Фестываль гумару працягваўся крыху больш за дзве гадзіны. Каманды былі абмежаваныя ў часе, каб паказаць на ўсю моц свае таленты. Аднак, нягледзячы на гэта, у іх усё атрымалася, пра што сведчыла рэакцыя гледачоў. Галоўны прыз дастаўся камандзе з Мядзельскага раёна «Пераехала камбайнам». На другім месцы каманда салігорскага «Форс мажору». За імі ідуць «Мы з 90-х» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Новы прэзідэнт Грузіі не гатовая супрацоўнічаць з Расіяй

Саламэ Зурабішвілі, якая ў сераду перамагла на прэзідэнцкіх выбарах у Грузіі, заявіла, што на гэты момант не гатовая да супрацоўніцтва з Масквой.

У інтэрв'ю рускай службе Бі-Бі-Сі Зурабішвілі адзначыла, што Тбілісі займае праеўрапейскую пазіцыю. Калі Захад, Еўропа ці ЗША пачнуць дыялог з Расійскай Федэрацыяй, то Грузія, як адзначыла палітык, «таксама будзе побач».

Яна сказала, што дыялог Тбілісі з Масквой павінен праходзіць «пры падтрымцы партнёраў» Грузіі. «Падчас перагавораў, якія я вяла з Расіяй будучы міністрам замежных спраў Грузіі, перад і пасля кожнай сесіі перагавораў, я кансультавалася з кіраўніцтвам Еўрапейскага саюза і амерыканскім пасольствам. І другі бок перагавораў ведаў пра гэта і прымаў гэта», — сказала яна.

Зурабішвілі падкрэсліла, што не збіраецца быць намінальным кіраўніком дзяржавы, паабяцаўшы стаць «самым актыўным прэзідэнтам» у пытаннях інтэграцыі ў ЕС і НАТА.

Украіна забараніла ўезд расійскім мужчынам ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў

Дзяржаўная пагранічная служба Украіны закрыла ўезд у краіну расійскім мужчынам ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў. Пра гэта паведаміў кіраўнік ведамства Пётр Цыгікал на пасяджэнні з удзелам прэзідэнта Украіны Пятра Парашэнкі, якое было прысвечана абараназдольнасці краіны ва ўмовах ваеннага становішча.

Ён заявіў, што на прапускных пунктах узмоцнены меры кантролю, абмежаваны ўезд для замежных грамадзян, у першую чаргу расіян. Пропуск магчымы, калі ўзнікне сітуацыя «гуманітарнага характару», напрыклад, пахаванне, удакладніў Цыгікал.

Прэзідэнт Украіны прапанаваў узмацніць патрабаванні і да рэгістрацыі грамадзян Расіі ў 10 абласцях краіны, дзе ўведзена ваеннае становішча. Прапановы павінны быць унесены на працягу сутак для зацвярджэння, дадаў Парашэнка.

«Чараўнік краіны Оз» узначаліў спіс самых уплывовых фільмаў у гісторыі

Навукоўцы з Турынскага ўніверсітэта правялі даследаванне, па выніках якога склалі рэйтынг найбольш уплывовых фільмаў у гісторыі. Узначаліла рэйтынг экранізацыя казкі Лаймэна Фрэнка Баўма «Чараўнік краіны Оз» (The Wizard Of Oz, 1939). Вынікі даследавання апублікаваны ў пятніцу ў часопісе Applied Network Science.

Як адзначылі вучоныя, звычайна поспех фільма вымяраецца па такіх паказчыках, як касавыя зборы або рэакцыя прафесійных кінакрытыкаў. Аднак, на думку аўтараў даследавання, такія крытэрыі могуць трапляць пад уплыў знешніх фактараў, у ліку якіх рэклама або трэнды, і не могуць зафіксаваць уплыў фільма з цягам часу.

У сваёй працы даследчыкі выкарыстоўвалі базу даных аб кінематографе IMDb (Internet Movie Database), у якой прадстаўлены больш за 47 тысяч фільмаў са 157 краін свету.

Па выніках даследавання, акрамя «Чараўніка краіны Оз», у тройцы лідараў апынуліся «Зорныя войны» і «Псіха». У спіс найбольш уплывовых кінастужак у гісторыі таксама патрапілі «Кінг-Конг» (1933), «2001 год: Касмічная адысея», «Нараджэнне нацыі» (1915), «Франкенштэйн» (1931), «Беласнежка і сем гномаў» (1937), «Знесеныя ветрам» (1939), «Браняносец «Пацёмкін» (1925) рэжысёра Сяргея Эйзенштэйна і іншыя.

Ці чулі?

Ззяе і ўначы!

Беларуская царква ў Лондане прызнана найлепшым рэлігійным будынкам свету

Пра гэты ўнікальны храм і пра шматлікія ўзнагароды, якія ён заваёўвае, «Звязда» нядаўна пісала. І вось у чацвер позна ўвечары на Сусветным архітэктурным фестывалі ў Амстэрдаме беларуская царква перамагла ў намінацыі «Найлепшы рэлігійны будынак», дзе былі прадстаўлены таксама рэлігійныя будынкі з Індыі, Турцыі, Тайланда, Аўстрыі, Ірана, Партугаліі і Сінгапура.

Нагадаем, што царква спраектавана брытанскім архітэктарам Цзыўаем Со па замове беларускай дыяспары ў Лондане. Каб дасканала перадаць і адчуць атмасферу беларускай архітэктуры, Цзыўай спецыяльна прыязджаў у нашу краіну ў 2013 годзе. Ён наведаў Ліду, Івацэвічы, пабываў у Строчыцах, дзе надзвычай шмат аўтэнтычных драўляных пабудоў. Усюды рабіў замалёўкі ўбачанага ў свой альбом. Абсалютным фаварытам для лонданца стала сталічная мураваная архітэктура Іосіфа Лангбарда. Вялікае ўражанне на яго аказала і царква Раства Багародзіцы ў Мураванцы (пра яе майстар нават асобна расказваў на адным з міжнародных форумаў).

Варта дадаць, што беларуская царква ў Лондане з'яўляецца таксама і мемарыялам — помнікам ахвярам чарнобыльскай катастрофы. «Царква не забруджвае навакольнае асяроддзе — гэта мой адказ чарнобыльскай трагедыі, ад якой экалагічна пацярпелі многія краіны. Будынак цалкам драўляны, а значыць паглынае вугляродзістыя злучэнні і не вылучае іх», — адзначае Цзыўай Со.

Гэта адзіная драўляная царква ў Лондане (драўляныя храмы тут не будавалі аж з часоў вялікага пажару ў 1666 годзе). «У Беларусі шмат лясоў. Доўгі час людзі жылі ў драўляных дамах, будавалі з дрэва цэрквы. Але, на жаль, з-за войнаў і багаборніцтва ў савецкія часы многія з іх не захаваліся. Таму менавіта гэты матэрыял мне здаўся сімвалам вашай краіны», — кажа архітэктар.

Будынак плошчай 69 квадратных метраў разлічаны на 40 прыхаджан. Таксама ў пабудове маецца шмат асвятляльных прыбораў. Выкарыстаць шмат лямпачак лонданца натхніў фільм «Ідзі і глядзі», дзе паказаны жудасныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, калі нацысты палілі людзей жыўцом. У напамін пра гэта беларуская царква ў Лондане ззяе ў цёмны час сутак.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Статыстыка

Анкета на пяць хвілін

Першыя вынікі перапісу насельніцтва з'явяцца ў пачатку 2020 года

У канцы лістапада завяршыўся першы этап падрыхтоўкі да перапісу насельніцтва. Яго праводзілі, каб праверыць адрасы ў гарадах, пасёлках гарадскога тыпу, буйных сельскіх населеных пунктах і складзі спісы жылых дамоў і памяшканняў у іх. Для гэтай задачы прыцягнулі тысячу рэгістратараў: найбольшая іх колькасць была ў Гомельскай вобласці — 187 чалавек, найменшая ў Мінску — 44. У асноўным былі задзейнічаны работнікі арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Рэгістратары павінны былі абследаваць усе пабудовы (у тым ліку і незавершаныя), дзе можа пражываць насельніцтва на момант правядзення перапісу, а таксама нежылыя памяшканні, занятыя арганізацыямі. З экіпіроўкі выдалі пасведчанні, планшэты, сумкі з адмысловымі лагатыпамі, знешнія акумулятары, канцылярскія прылады, а для бяспекі — свісткі і ліхтарыкі. На планшэтах была ўсталявана спецыяльная праграма, якая цалкам аўтаматызавала працэс збору інфармацыі, дазваляла працаваць з картамі і ў рэжыме рэальнага часу перадаваць даныя на сервер Белстата.

Да пачатку абходу ў спісе адрасоў значылася каля 500 тысяч будынкаў. Спіс быў складзены на падставе Рэестра адрасоў і Рэгістра насельніцтва. У выніку рэгістратары выдалілі з пераліку каля 8 тысяч дамоў, а дадалі — амаль 126 тысяч. Па папярэдніх звестках, абследавана 626 тысяч пабудоў.

Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА расказала аб праблемах, з якімі сутыкнуліся падчас гэтага этапу. Так, на ўчастках новай забудовы з-за адсутнасці шыльдаў на будучых дамах немагчыма было вызначыць, які нумар ім трэба прысвоіць. Пры перайменаванні вуліц на асобных будынках заставаліся надпісы са старымі найменнямі або віселі адразу дзве шыльды — са старым і новым адрасам. Як правіла, гэта датычылася прыватнага сектара. Паўтараліся нумары дамоў на адной і той жа вуліцы, а ў адміністрацыйнага і жылога будынкаў мог быць адзін паштовы адрас. Часам на мясцовасці адсутнічалі жылыя дамы, хоць па даных адміністрацыйных крыніц у іх былі зарэгістраваны людзі. А па адрасах, дзе стаялі запраўкі, цеплавыя пункты, сталовыя, гандлёвыя цэнтры, магло быць зарэгістравана насельніцтва.

Затраты на гэты этап падрыхтоўкі былі максімальна мінімізаваны. Частку планшэтаў Белстату перадала Міністэрства аховы здароўя (потым тэхніка вернецца ведамству), частку набылі за кошт спонсарскіх сродкаў розных арганізацый краіны. Рэгістратары працавалі за той заробак, які атрымліваюць па месцы працы. За грошы рэспубліканскага бюджэту былі закуплены толькі паслугі сувязі па перадачы даных, сумкі, канцылярскія прылады, аплачана страхаванне перапісчыкаў і планшэтаў.

Перапіс насельніцтва пройдзе ў кастрычніку наступнага года. Праводзіць яго будзе каля 10 тысяч рэгістратараў, спатрэбіцца (з улікам рэзерву) 12,8 тысячы планшэтаў. У Белстаце падкрэсліваюць, што пераход на інфармацыйныя тэхналогіі дазволіць у тры разы скараціць час правядзення перапісу — з 15 хвілін да 5 на чалавека (без пытальніка па сельскай гаспадарцы).

У анкеце з'явяцца новыя пытанні — па міграцыі (у тым ліку працоўнай), атрыманні дадатковай адукацыі. Паколькі дзяржава заклапочана дэмаграфіяй, у жанчын будуць цікавіцца, ці плануюць яны нараджаць дзяцей.

— Пытанні рэлігіі ў нас не прадугледжаны. Гэта з'яўляецца міжнароднай рэкамендацыяй. Беларусь таксама лічыць немэтазгодным уключэнне такіх пытанняў, каб пазбегнуць непаразумення, — адзначае **намеснік старшыні Белстата Жанна ВАСІЛЕЎСКАЯ.** — Што датычыцца моўных пытанняў, то іх будзе два. Першае — пра тое, на якой мове вы пачалі размаўляць у дзяцінстве, другое — пра мову, на якой размаўляеце дома. На планшэтах будзе дадзена магчымасць адказаць як па-руску, так і па-беларуску.

Перапісчыкі будуць прасіць грамадзян таксама назваць свой ідэнтыфікацыйны нумар — гэта паскорыць запаўненне анкет, бо частка інфармацыі пра чалавека (тыя ж прозвішча, пол, узрост) адразу загрузіцца аўтаматычна. Але калі хтосьці адмовіцца агучваць нумар, даныя будуць набіраць уручную.

Мяркуецца, што папярэднія вынікі перапісу будуць апублікаваныя ў пачатку 2020 года, выніковыя — бліжэй да канца 2020-га.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Будзь у курсе!

На навагоднія і калядныя святы — дадатковыя цягнікі

З 22 снежня да 12 студзеня Беларуская чыгунка прызначае дадатковыя цягнікі і павялічвае перыядычнасць курсіравання цягнікоў у міжнародных і міжрэгіянальных зносінах, паведамілі ў прэс-службе магістралі.

У міжнародных зносінах дадаткова прызначана 18 цягнікоў па найбольш запатрабаваных маршрутах: Мінск — Масква — Мінск, Мінск — Санкт-Пецярбург — Мінск, Масква — Брэст — Масква, Санкт-Пецярбург — Бранск, Гомель — Сноўск — Гомель, Мінск — Вільнюс — Мінск.

У міжрэгіянальных зносінах у навагоднія і калядныя святы будзе курсіраваць 120 дадатковых цягнікоў. Іх прызначэнне і павелічэнне перыядычнасці курсіравання прадугледжана на традыцыйна папулярных у пасажыраў напрамках: Мінск — Гомель, Мінск — Брэст, Мінск — Віцебск, Мінск — Пінск, Віцебск — Магілёў, Віцебск — Брэст, Магілёў — Гомель, Мазыр (ст. Козенкі) — Мінск.

Работа па прызначэнні дадатковых цягнікоў у міжрэгіянальных і міжнародных зносінах працягваецца.

Не сезон

Лавіць рапушку — нельга

У рыбалоўных угоддзях Беларусі да 20 снежня забаронена лоўля еўрапейскай рапушкі ў сувязі з яе нерастам. Забарона ўведзена пастановай Мінпрыроды ад 2 снежня 2015 года № 42 пасля выключэння рапушкі са спіса ахоўных відаў.

Рапушка — самы дробны прадстаўнік сігавых. Яшчэ зусім нядаўна від быў уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі і забаронены да лоўлі. Зараз лавіць рапушку дазволена, за выключэннем нераставага перыяду. За здабычу кожнай асобіны ў гэты забаронены час парушальнікам прыйдзецца выплаціць па 9 базавых велічынь (220,5 рубля), нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ФАБРЫКА УРАЖАННЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нягледзячы на тое, што кожны гаспадар імкнецца прыпаднесці госцю свой унікальны рэцэпт адпачынку, сельскія прадпрымальнікі актыўна дзеляцца са сваімі калегамі ідэямі. Больш за тое, яны пачалі аб'ядноўвацца ў кластары, каб стварыць суперпрадукт, на які лягчэй завабіць турыста. Напрыклад, гаспадар аграсядзібы з Валожынскага раёна, да якога людзі прыехалі вучыцца пячы хлеб, абавязкова параіць гасцям завітаць да суседзяў на мядовыя квэсты, конныя паходы ці кулінарныя фестывалі. Ад такой сумеснай працы выйграюць і турысты, якія атрымліваюць цікавыя маршруты і насычаны актыўнасцямі ды адкрыццямі адпачынак, прадпрымальнікі (колькасць наведвальнікаў значна прырасла, і часта «лішніх» кліентаў гаспадары перанакіроўваюць да суседзяў).

Да таго ж разам можна замахвацца на маштабныя праекты і атрымліваць пад іх інвестыцыі. Так, спажывецкі кааператыў «Валожынскія гасцінцы» ў найбліжэйшы час плануе запусціць трансгранічны маршрут «Шляхам Вітаўта», які працягнецца ад Ракава да Тракайскага замка ў Літве. Падчас такога падарожжа можна будзе больш даведацца пра гісторыю Вялікага Княства Літоўскага.

БУДЗЕ

Яшчэ адна ідэя, якая хутка здзейсніцца на Валожыншчыне, — стварэнне так званага спажывецкага кошыка, у якім турысты знойдуць самыя розныя прадукты, якія ім прапануюць гаспадары аграсядзіб. Тут і хлеб, і сыры, і мядовая ды мясная прадукцыя.

Між іншым, арганічнае земляробства — адзін з кірункаў далейшага развіцця вясковага турызму на Беларусі. Многія гаспадары аграсядзіб адчулі, што такім чынам можна завабіць новых кліентаў, і сталі актыўней браць зямлю, каб вырошчваць уласную экалагічна чыстую прадукцыю. У сваю чаргу фермеры таксама не спяць у шапку, а шукаюць новыя шляхі прыбытку, прапануюць экскурсіі на фермы, фестывалі, майстар-класы. Тут можна згадаць гаспадарку «ДАК», куды з задавальненнем едуць людзі, каб паглядзець на коз і на тое, як выпрабляецца малочная прадукцыя. Многім спадабаўся «Кукуполіс» — квэст у лабірынце з кукурузы.

Падчас навукова-практычнай канферэнцыі, якая праводзілася сумесна з Белаграпрамбанкам і Міністэрствам спорту і турызму, **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА** заўважыла, што зараз гаспадарам сядзіб трэба рабіць ухіл на крэатыўнасць і інавацыйнасць. У будучым турызм будзе завязаны на ўражаннях, менавіта за іх турысты гатовы плаціць вялікія грошы. І ад вясковых прадпрымальнікаў тут не заўсёды патрабуюцца вялікія фінансавыя інвестыцыі — куды важнейшыя веды і творчасць. Шпаркае развіццё агратурызму можна звязаць з развіццём IT-галіны. Сёння мы ўсё менш рухаемся, бо вучыцца і рабіць пакупкі можна не выходзячы з дому. Толькі турызм выратуе чалавека і падарыць яму жывыя зносіны.

Таксама ў трэндзе зялёная эканоміка, гендарныя пытанні і так званая сацыяльная адказнасць. Усе гэтыя ідэі зараз актыўна прапагандуюцца ў Еўропе. Каб стварыць прадукт, запатрабаваны ў тым ліку і на замежным рынку, важна ўпісацца ў канцэпцыю ўстойлівага развіцця. І беларускі агратурызм пачаў працаваць з новымі тэмамі. Так, на Валожыншчыне з'явіўся турыстычны маршрут, даступны людзям з інваліднасцю. Таксама ў беларускіх аграсядзібах пачаў праводзіцца фестываль для састарэлых людзей «Крэатыўны ўзрост». Хоць трэба сказаць, што і раней многія гаспадары супрацоўнічалі з бабулямі і дзядулямі, якія ведаюць фальклор, могуць навучаць рамёствам, дзяліцца рэцэптамі. Удзельнікі канферэнцыі ўпэўнены: сёння стартапы трэба праводзіць не толькі для моладзі, але і для пенсіянераў, спрабаваць аб'ядноўваць энергію маладых і досціп старэйшага пакалення.

Амаль траціну грошай турысты трацяць на ежу, 20—30 працэнтаў вандроўнікаў матываваныя пакаштаваць сапраўдныя аўтэнтычныя прадукты па месцы іх вытворчасці. Значыць аграсядзібам трэба рабіць стаўку на гастранамію, але, на жаль, пра беларускую кухню амаль нічога не ведаюць не тое што за межамі, нават у сваёй краіне. Хоць гаспадары сядзіб упэўнены, нам ёсць, чым ганарыцца і мы яшчэ ўразім свет. І ў найбліжэйшы час арганізацыя «Адпачынак у вёсцы» магла б узяць на сябе гэтую місію па раскрутцы айчынных рэцэптаў. А дапамагаць збіраць інфармацыю пра нацыянальную кухню, наносіць на інтэрактыўную гастранамічную карту маглі б студэнты...

З 2008 года праводзіцца конкурс «Найлепшая аграсядзіба года». Гэтым разам было пададзена 46 заявак. Гаспадарам трэба было прэзентаваць сябе праз інтэрнэт, даслаць фатаграфіі і відэаролікі. Найлепшай стала сядзіба «Запаведны востраў» у вёсцы Шо Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Уласна, актыўнае прыцягненне моладзі да вясковага бізнесу — таксама адзін з сучасных трэндаў. Ужо сёння хлопцы і дзяўчаты з факультэта міжнародных адносін БДУ, якія плануюць сваю будучыню звязаць з агратурызмам, знаёмяцца з гаспадарамі, трапляюць да іх на практыку і спрабуюць стварыць цікавыя праекты, якія можна рэалізоўваць на сяле.

Давядзецца паламаць галаву і над тым, які турпрадукт нашы вёскі змогуць прыпаднесці «нетрадыцыйнаму» турысту. Прыкладна 145 мільёнаў кітайцаў штогод падарожнічаюць па ўсім свеце, і мы маглі б хоць невялікі працэнт з іх завабіць у Беларусь. Летась нашу краіну ўжо наведала каля трох тысяч гасцей з Кітая, сёлета гэта лічба падвоіцца. Але гэтыя госці пакуль выбіраюць ваенна-патрыятычны кірунак, цікавяцца так званым «чырвоным» турызмам, і трэба высветліць, як і, галоўнае, чым іх завабіць у аграсядзібы.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Даступная біяэтыка

Прэзумпцыя згоды... пры поўным інфармаванні

«Ці шмат на працягу свайго жыцця мы задумваемся пра смерць? Як часта? Магу выказаць здагадку, што вялікая колькасць спраў, задач і пытанняў, якія мы з вамі вырашаем штодня, перашкаджаюць нам засяродзіцца на тым, што насамрэч важна. Вы спытаеце, а навошта гэта трэба? І скажаце: «Ну смерць і смерць, мы нічога не зменім, навошта лішні раз задумвацца аб негатыўным, што будзе, тое і будзе?!» І так, сябры, думае вялікая колькасць людзей. Я не хачу казаць, што яны не маюць рацыю, і спрачацца, але дакладна ведаю, што свет гэтых людзей можа перавярнуцца, варта толькі ім ці іх сваякам рэальна паглядзець у вочы смерці...» — гэта ўрывак з эсэ студэнта II курса лячэбнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Уладзіслава МАРЦІНОВІЧА. Яго работа заняла другое месца ў Рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх работ «Даступная біяэтыка». Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Міністэрства аховы здароўя, Рэспубліканскі камітэт па біяэтыцы сумесна з аддзелам па біяэтыцы Савета Еўропы пры падтрымцы Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску.

Плакат «Жыццё застаецца», на думку журы, стаў пераможцам. Аўтары — студэнты Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Паліна ПЯТРОВІЧ, Елізавета ДОНЧАНКА і Іван КАЛЕСНІК.

Валерыя САКОЛЬЧЫК, беларускі эксперт у Камітэце па біяэтыцы Савета Еўропы падкрэслівае, што конкурс дапамог уцягнуць у абмеркаванне біяэтычнай праблематыкі студэнтаў з усёй краіны: удзел у ім узялі не толькі будучыя медыкі, для якіх гэтыя пытанні блізкія з прычыны іх прафесіі, але і будучыя юрысты, філолагі, архітэктары, інжынеры, аграномы... Для папулярызацыі ідэй біяэтыкі і развіцця культуры біяэтычных дыскусій праведзены конкурс аказаўся нават больш важны, чым навуковыя канферэнцыі, таму што ў конкурсных работах кожны мог выказаць сваю пазіцыю ў дачыненні да пытанняў правоў і свабоды асобы, біямедыцыны, медыцынскай этыкі...

«У Рэспубліцы Беларусь, як вядома, дзейнічае прэзумпцыя згоды на выманне органаў... Пры прэзумпцыі «нязгоды» можна сутыкнуцца з вострым недахопам органаў для трансплантацыі, а на гэтай глебе з'яўляюцца чорныя рынкі органаў, шантаж, злачыннасць і мноства іншых непрыгожых з'яў. Таму, з майго пункту гледжання, найбольш правільнае рашэнне — прэзумпцыя «згоды», але пры адной важнай умове: мінімум 65 працэнтаў насельніцтва павінны быць цалкам азнаёмленыя з усімі нюансамі прэзумпцыі, што дзейнічаюць у нашай краіне.

Мяне вельмі насцярожыў той факт, што ў краіне з насельніцтвам у 9,5 мільёна толькі 2300 чалавек напісалі адмову на выкарыстанне іх органаў для трансплантацыі пасля смерці. Няўжо толькі яны супраць згаданай прэзумпцыі і не згодныя з ёй? Нешта я сумняваюся. Таму вырашыў правесці апытанне насельніцтва (500 чалавек). Гэта былі людзі рознага ўзросту і адукацыі. Вынік пацвердзіў мае асцярогі і, мякка кажучы, здзівіў...» — разважае Уладзіслаў Марціновіч.

— Атрымліваецца такая сканцэнтраваная, прадметная гаворка пра літаратуру — і не толькі — у інтэр'ерах Нацыянальнай бібліятэкі, — гаворыць аўтар і вядучы праекта. — Цяпер на тэлеэкранах часцей з'яўляюцца зоркі эстрады, спорту — асобы, так скажам, медыйныя. А гэта фігуры хоць і значныя, якія займаюцца літаратурай, гісторыяй, але, на жаль, не так добра вядомыя шырокаму колу гледачоў, асабліва калі гэтыя асобы з рэгіёнаў, як рэктар Магілёўскага ўніверсітэта Дзяніс Дук, краязнаўца Міхась Казлоўскі з Маладзечна, прафесар Іван Штэйнер з Гомеля ды іншыя. І як паказваюць водгукі на праграму, гэтыя знаёмствы аказваюцца для многіх карыснымі і цікавымі, многія адкрываюць для сябе імёны маладых — Юліі Алейчанкі, якая атрымала сёлета Нацыянальную літаратурную прэмію ў намінацыі «Дэбют», Васіля Дранько-Майсюка, шоўмена, артыста і пісьменніка, Міхаіла Бараноўскага, які ўзначаліў філіял музея Максіма Багдановіча і стварыў музычны гурт «Нельга забыць»... Таксама вялікая колькасць водгукаў была на сустрэчу з Людмілай Рублеўскай, якая па глядацкай увазе паставіла своеасаблівы рэкорд. І я лічу, што гэта вельмі важна, прапагандаваць і паказваць сучасную беларускую літаратуру і культуру.

— Навум Якаўлевіч, у вас у гасцях пабывалі ўжо многія — ад міністра інфармацыі Аляксандра Карлюкевіча да чалавека-аркестра Васіля Дранько-Майсюка. Хтосьці з суразмоўцаў адкрыўся з нечаканага боку, сказаў тое, што ніяк не меркавалася пачуць?

— Усе неяк раскрываюцца, даюць нештампаваныя адказы і па-добраму здзіўляюць. Напрыклад, Алесь Карлюкевіч расказаў, як ён быў сельскім юным бібліятэкарам, а Васіль Дранько-Майсюк назваў сваім любімым паэтам Леаніда Дранько-Майсюка — і не таму, што гэта ягоны бацька, а глыбока і слушна абгрунтаваў такі выбар. Раней мы шмат гаварылі з земляком — пісьменнікам, драматургам і навукоўцам Пятром Васючэнкам пра Полацк і тэрмін «Полацкі менталітэт», а ў гутарцы перад тэлекамерамі я таксама пачуў ад яго нешта новае і нечаканае — Пятро мысліць нетрадыцыйна, вельмі арыгінальна.

— Ведаю, што ў вас ёсць некалькі «традыцыйных» пытанняў, якія вы задаяце кожнаму ўдзельніку. Мне здаецца, будзе справядліва, калі на іх адкажа і сам аўтар і вядучы праграмы. Такім чынам: што вы зараз чытаеце і якую кнігу, на ваш погляд, мусіць прачытаць кожны беларус?

— Думаю, кожнаму беларусу абавязкова варта прачытаць Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Янку Брыля, Міхася Стральцова, Рыгора Барадуліна... А ў мяне цяпер на стале ляжыць вельмі цікавая кніга паэзіі Анхелы Эспіносы Руіс — гэта іспанка, маладая дзяўчына, якая ўпадабала і вывучыла беларускую мову, прычым настолькі, што цяпер піша па-беларуску вершы, напоўненыя асаблівай цеплынёй і пачуццём любові. Таксама перачытваю кнігу Андрэя Федарэнкі «Мяжа», і, канешне, заўжды маю томік Янкі Брыля.

— Што для вас родная мова? Ці патрэбныя асаблівыя ўмовы, каб ужываць яе штодня?

— Мова — напэўна, гэта сутнасць існавання мяне як асобы, наогул маёй сям'і, таму што і дзеці размаўляюць са мной толькі па-беларуску, і ўнуку, які падрастае, мы чытаем беларускія казкі, і ён ужо ведае першыя словы на роднай мове. Як чалавеку, які імкнецца да справядлівасці, мне вельмі важна, каб беларуская мова была паўнацэнным чыннікам нашага жыцця, бо гэта душа, унутраная сутнасць кожнага з нас. Хоць я нарадзіўся ў Полацку не ў беларускамоўнай сям'і, але з самага дзяцінства чуў мову, і мне натуральна адчуваць сябе ў ёй. І часам лаўлю сябе на тым, што, разважаючы на жыццёва важныя пытанні, раблю гэта па-беларуску альбо сінхронна перакладаю думку для суразмоўцы.

— З чаго пачынаецца патрыятызм — з любові да мовы ці яшчэ раней?

— Было б абмежаваннем сказаць, што з мовы, бо гэта толькі адзін складнік, хоць і безумоўна важны. Патрыятызм, мяркую, пачынаецца з адчування роднага месца, сваіх родных рэчаў. Калі ў 2-м класе я трапіў у бальніцу і з мяне знялі ўсю вопратку і далі бальнічную, памятаю, адчуў сябе літаральна нікім — і гэта страшнае адчуванне. Так што патрыятызм пачынаецца з тых звыклых рэчаў, якія чалавек бачыць дома, з малюнкаў у буквары, як гаворыцца ў вядомай песні, з гэтага ўсяго. А мова дазваляе глыбей адчуць, што ў нас ёсць свая дзяржава, свая гісторыя, свая культура, наогул, што МЫ ёсць, і мы — не прыстасаванне да кагосьці іншага, а самастойная краіна. Самае галоўнае, на мой погляд, — пераадолець адчуванне беларускасці як нейкай архаічнасці, вясковасці і другаснасці, пачаць паважаць саміх сябе (як казаў Купала, «людзьмі звацца»), каб нас паважалі іншыя.

— Гледачам праграма «Суразмоўцы» дазваляе зазірнуць у глыбіню літаратурных працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі, лепш пазнаёміцца з гісторыяй і сучаснымі творцамі. А што яна дае вам, як чалавеку, які сам знаходзіцца ўнутры літаратуры?

— Па-першае, адчуванне гонару і любасці за тое, што вакол мяне ёсць такія людзі, такія цікавыя і разнастайныя творцы, з якімі можна пазнаёміць іншых — і мо, нехта таксама іх палюбіць, будзе ганарыцца сваімі суайчыннікамі. А па-другое, вельмі важна паказаць, што беларусы — адукаваны і культурны народ, так бы мовіць, адкрыць нас для саміх сябе.

Запісала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

КАМАНДУЮЧЫ замежнымі войскамі генерал-лейтэнант Рэйнхард Гелен стаяў каля акна і назіраў, як першы вясенні дождж амывае пыльныя вуліцы Берліна. Нячутна ўвайшоў ад'ютант камандуючага і паведаміў, што штурмбанфюрар СС Эрых Хенельхаўпт і оберштурмбанфюрар СС Ота Скарцэні чакаюць у прыёмнай.

— Паклічце, — ціха загадаў Гелен і накіраваўся да вялікага пісьмовага стала, закладзенага рознымі папкамі.

— Хайль Гітлер! — ускінуўшы рукі ў партыйным прывітанні, прывіталіся госці.

— Хайль, — кіўнуў галавой Гелен. — Прашу, панове, сядайце.

Хенельхаўпт і Скарцэні селі адзін насупраць аднаго і зацікаўлена паглядзелі на генерала.

— Панове, — адкінуўшыся на спінку крэсла, мяккім голасам загаварыў Гелен. — Мы з вамі патрыёты Вялікай Германіі і верым, безумоўна у перамогу нямецкай зброі над азіяцкімі варварамі. Але мы з вамі разведчыкі, і зыходзім у сваёй дзейнасці не са звышаптымістычных выступленняў доктара Гебельса, а з рэальных фактаў. Нямецкай арміі патрэбны час на перафарміраванне і пераўзбраенне. Нашы вучоныя вось-вось павінны запусціць у вытворчасць зброю адплаты. А пакуль мы вымушаны адыходзіць. Восенню нашы войскі адступяць на тэрыторыю Польшчы. Так, панове афіцэры, на тэрыторыю Польскага генерал-губернатарства. І да гэтага часу мы павінны арганізаваць на Украіне, у Беларусі і Прыбалтыцы актыўную дыверсійную дзейнасць. У мяне ёсць сакрэтныя даныя з тэрыторыі акупаванай намі Беларусі. Дык вось, панове, з 1941 года да цяперашняга 1944 года партызанамі было забіта 125 тысяч нашых салдат, падарвана больш за 11 тысяч эшалонаў, спалена і знішчана 300 самалётаў, больш за тысячу танкаў і амаль 20 тысяч аўтамабіляў. Я ўжо не кажу пра аўтаматы, кулямёты і іншыя віды зброі.

Ён убачыў, як у прысутных пасля названых лічбаў здзіўлена ўзняліся бровы.

— Так, панове, мы страцілі за гэтыя тры гады амаль дзесяць паўнавартасных пяхотных дывізій. Дык давайце скарыстаем вопыт нашых ворагаў. Намі распрацаваны план «Цэпелін», які падтрымаў фюрар. Адказным за рэалізацыю праекта прызначаны штурмбанфюрар СС Эрых Хенельхаўпт.

— Так ёсць! — прыпадняўшыся, адказаў Хенельхаўпт.

— Да чэрвеня месяца, — працягваў Гелен, — мы павінны стварыць дыверсійнае падраздзяленне Ягдфербандэ-Ост. Камандзірам яго прызначаны оберштурмбанфюрар СС Ота Скарцэні.

— Слухаюся! — ускочыў Скарцэні.

— Сядайце, оберштурмбанфюрар, — махнуў рукою генерал. Ён раскрыў папку і пачаў чытаць дакумент.

«Галоўная задача Ягдфербандэ-Оста — правядзенне спецыяльных аперацый у варожым тыле; разведванне і ініцыяванне антысавецкага руху супраціўлення на Усходзе і дапамога яму; дапамога нацыяналістычным аб'яднанням зброяй, інструктарамі, байцамі». Гэта вялікая справа, панове! І няхай вам дапаможа Бог!

Аперацыя па разгортванні антысавецкага супраціўлення атрымала кодавую назву «Мілая котка» (Liebchenkatzen) і ахоплівала тэрыторыю ад Балтыйскага да Чорнага мора. Беларускі напрамак атрымаў назву «Чорны кот» (Schwarzkatze). Аснову дыверсійных груп склалі салдаты спецыяльнага батальёна «Дальвіц». Паводле распрацаванага плана, згаданыя групы павінны дэсантавацца на тэрыторыі БССР і, абапіраючыся на беларускіх дзеячаў, якія не адышлі з немцамі, стварыць антыкамуністычнае падполле.

Былі падрыхтаваны і дэсантаваны тры групы. Першая ў складзе чатырох чалавек прызямлілася каля мястэчка Дзятлава. Другая група (28 чалавек) высадзілася ў раёне Івянца. Трэцяя група (4 чалавекі) была закінута бліз мястэчка Сапоцкін на Гродзеншчыне.

Камандзірам трэцяй групы быў прызначаны Іван Мікалаевіч Карыцька. Нарадзіўся і жыў у Гродне. Пасля 17 верасня 1939 года пайшоў працаваць міліцыянерам. У 1942 годзе ўступіў у Беларускую самаахову, удзельнічаў у акцыях супраць партызан. Даслужыўся да камандзіра роты. Быў праведзены ў перасыльны лагер для яўрэяў, гета «Калбасіна», намеснікам камандзіра зондэркаманды.

...Ноч была вельмі зручнай для дэсантавання: неба поўнасцю зацягнута хмарамі, накрапвае дробны дождж, але без ветру. Прызямліліся даволі кучна, таму хутка сабраліся разам. Парашуты тут жа закапалі, паліўшы схрон спецыяльнай вадкасцю ад сабак. Падцягнулі амуніцыю, перазарадзілі аўтаматы і, сарыентаваўшыся па карце, рушылі ў дарогу. Да раніцы яны павінны былі трапіць у вёску Калеты, дзе чакаў сувязны. Праз дзве гадзіны спешнай хады з Карыцькам параўняўся радыст групы Мікіта Аўрамчык.

— Камандзір, нешта мы не туды ідзём. Я ж ведаю гэтыя мясціны. Калеты значна правей.

— І я ведаю гэтыя мясціны! — строга абарваў Мікіту Карыцька. — А калі спатрэбяцца твае веды, я абавязкова запытаюся.

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Фактычна ўсё жыццё Віктара Варанца звязана з Гродзеншчынай. У самім Гродне ён у 1962 годзе нарадзіўся, у 1985-м скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, атрымаўшы дыплом філолага і накіраванне на працу ў адну з сельскіх школ непадалёк ад роднага горада. Пасля выкладаў беларускую мову ў абласной гімназіі № 1. І вось ужо больш за дваццаць пяць гадоў займаецца выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. А ў вольны час піша: пачынаў з вершаў, але апошнім часам аддае перавагу прозе. Прычым, па прызнанні самога аўтара, усе яго творы так ці інакш звязаныя з роднымі мясцінамі. Што ж, яшчэ Фолкнер сцвярджаў, што яго маленькая паштовая марка роднай зямлі вартая таго, каб пісаць пра яе ўсё жыццё. Між тым нарадзіўся славуты пісьменнік у Нью-Олбані штата Місісіпі — горадзе, які значна саступае нашаму Гродна і па плошчы, і па колькасці насельніцтва. Хтосьці запярэчыць, не паддаўшыся на жарт, што такое параўнанне не зусім карэктнае, але, думаю, пагодзіцца ў галоўным: родная зямля, і праўда, самая невычэрпная крыніца натхнення.

Алесь БАДАК

Віктар ВАРАНЕЦ

АПОШНІ ФОРТ

Аўрамчык паціснуў плячыма і вярнуўся на ранейшае месца.

Калі сонца пачало павольна ўздымацца на зямлёй, камандзір аб'явіў прывал.

— Заяц у дазор! Аўрамчык, настрой рацыю! — скамандаваў падначаленым. Застаўшыся вольным, Пятро Скабец, чацвёрты з групы, тут жа прылёг пад вялікімі дубам і заснуў.

— Рацыя гатова, — далажыў Аўрамчык.

— Перадай: прызямліліся нармальна. Крочым да сувязнога.

Іван расклаў карту і пачаў нешта па ёй вылічваць. Хвілін праз дзесяць вярнуўся Сямён Заяц.

— Камандзір, нешта тут не так. Недалёка адсюль скрыжаванне дарог. Стаіць рэгуліроўшчыца. Я з хвіліну паназіраў. Дык вось, некаторыя вайскоўцы пытаюцца, дзе Сапоцкін, і яна накіроўвае ў бок, адкуль мы прыбеглі. Мы не ў Калеты ідзём, камандзір?

Да Карыцькі павярнуўся Аўрамчык, прыпадняў галаву і Скабец.

Карыцька абвёў іх цяжкім позіркам і глыбока ўздыхнуў.

— Добра, слухайце сюды. Каб пазбегнуць правалу, немцы пусцілі ў батальёне дэзу, што мы ідзём у Калеты. На самай справе наша база будзе ў Навумавічах.

— Але ж у Навумавічах нават лесу нармальнага няма, — амаль закрычаў Аўрамчык.

— А нам і не патрэбны лес, — спакойна адказаў Іван. — Мы размесцімся ў форце № 2.

— Дык яго ж узарвалі ў сорак першым.

— Узарвалі, — пагадзіўся Карыцька. — Але ў сорак трэцім сіламі ваеннапалонных і яўрэяў з «Калбасіна», дзе я служыў, мы ўсё аднавілі, адрамантавалі, толькі ўваход пакінулі разбураным.

— А будаўнікоў..? — запытаўся Заяц.

— Назаўсёды пакінулі вартаваць форт! — засмяяўся Карыцька.

Наступнай ноччу яны дасягнулі форта № 2. Уваход у цытадэль і сапраўды быў поўнасцю разбураны. Але прыкладна метраў за дваццаць ад яго за кустамі шыпшыны Іван паказаў іншы добра замаскіраваны ўваход. Дыверсанты паднялі люк і адзін за адным спусціліся па доўгай металічнай лесвіцы ўніз. Іван запаліў ліхтарык. Перад імі быў доўгі вузкі калідор. Усе рушылі наперад. У канцы калідора ўбачылі двое дзвярэй.

— Стойце тут! — загадаў Іван і, адчыніўшы левыя дзверы, увайшоў у пакойчык. Там стаяў нейкі агрэгат з вялікім колам, рамянямі, рознакаляровымі лямпачкамі. Карыцька адклаў ліхтарык, шчоўкнуў некалькімі тумблерамі, затым узяўся дзвюма рукамі за рэмень са скураной пяцелькай на канцы і рэзка рвануў на сябе. Дызель гучна чхнуў, стрэліў — і раптам пачулася роўнае механічнае пастукванне. Рухавічок запрацаваў. Тут жа ў пакойчыку і на калідоры загарэліся лямпачкі.

Іван выйшаў з пакоя і адчыніў дзверы насупраць. Там была невялічкая зала, з якой на тры бакі разыходзіліся галерэі.

— Вось тут мы і спынімся, — сказаў Карыцька. — Прама — пакой з ложкамі, налева — кухня і санвузел. Направа — арсенал. Размяшчайцеся, панове.

Усе накіраваліся прама, з захапленнем азіраючыся па баках. Карыцька звярнуў у пакой са зброяй. Калі дыверсанты распакавалі свае заплечнікі і размеркаваліся па двух'ярусных ложках, у спальню ўвайшоў Іван з ручным нямецкім кулямётам MG-42 у руках.

— Auf Wiedersehen! — спакойна развітаўся ён з паплечнікамі і націснуў курок. Раскацістым рэхам прашамкала зброя. Праз імгненне на падлозе ляжалі тры трупы.

— Ну вось неяк так, — прагаварыў Карыцька і выйшаў з пакоя. Ён накіраваўся на кухню, падышоў да вялікай шафы з металічным посудам і, пацягнуўшы яе на сябе, адскочыў убок. Шафа з посудам грымнулася на падлогу. Карыцька прыкладам аўтамата пачаў абіваць тынкоўку на сцяне. Праз хвіліну там выразна абазначыліся невялічкія дзверцы. Іван дастаў з кішэні ключ, павярнуў яго ў адтуліне і моцна націснуў плячом. Дзверы амаль бясшумна адчыніліся. Паказалася доўгая нізкая галерэя. Каля самага яе ўвахода на падлозе ляжала скрыня з-пад снарадаў. Іван прысеў на кукішкі і адчыніў скрыню. Яна да паловы была запоўнена залатымі каронкамі, ланцужкамі, пярсцёнкамі.

— Вось мы, мае харошыя, ізноў сустрэліся, — пяшчотна прашаптаў Карыцька. — Дары жыдоўскія з гета «Калбасіна» найлепшаму сябру Івану!

І ён гучна зарагатаў. Затым, пасур'ёзнеўшы, перасыпаў золата ў заплечнік, а сам вярнуўся ў арсенальную. Дастаў з кішэні бікфордаў шнур, прыладзіў да толавай шашкі і паклаў пякельную машынку ў скрыню з гранатамі, пасля чаго падпаліў шнур і пабег у галерэю. Шчыльна зачыніў дзверы і, нізка згінаючыся пад цяжарам заплечніка, шпарка накіраваўся па цёмным калідоры. За спінай пачуўся моцны выбух, зверху пасыпалася зямля, тынкоўка, нейкае смецце.

— Форт № 2 зноў загадаў доўга жыць, — з усмешкай прамовіў Карыцька і пакрочыў далей. Хвілін праз трыццаць ён спыніўся перад дзвюма дзвярыма. На адной з іх панямецку было напісана «Форт № 3», на другой «Запасны выхад». Іван адсунуў клямку на дзвярах запаснога выхаду, адчыніў іх і пайшоў далей. Крокаў праз сто мужчына апынуўся каля лесвіцы, што вяла наверх. Іван паклаў на падлогу заплечнік, аўтамат, з цяжкасцю падняўся, упёрся галавой і рукамі ў люк і моцна націснуў. Люк крыху адсунуўся. Карыцька прасунуў рукі ў шчыліну і яшчэ мацней націснуў. Люк адышоў у бок. Мужчына спусціўся па заплечнік і аўтамат, выпхнуў іх вонкі і вылез сам. Ён апынуўся ў хмызняку. Метраў за пяцьсот былі бачны змрочныя абрысы трэцяга форта. Іван скінуў камуфляжны камбінезон. Пад ім быў досыць паношаны цывільны касцюм. Дастаў з заплечніка парэпаныя боты і кепку, пераабуўся. Выцягнуў з кішэні пашпарт на імя Будніка Пятра Пятровіча, пагартаў і вярнуў на месца. Устаў, агледзеўся. Крокаў за дваццаць убачыў адзінокі куст бэзу. Падышоў бліжэй, выцягнуў дэсантны нож, усадзіў па рукаятку сантыметраў за дваццаць ад куста і правёў па ўсім радыусе. Затым моцна рвануў куст на сябе. Той паваліўся на бок, адкрыўшы крышку невялічкага схрона. Туды Карыцька акуратна паклаў свой заплечнік з золатам, вярнуў куст на месца і паправіў вакол траву. Адышоў на пару крокаў і пільна ўгледзеўся. Ніякіх слядоў не было бачна. Задаволена ўсміхнуўшыся, Іван зашпурнуў убок непатрэбны аўтамат і пакрочыў на Гродна.

У верасні 1979 года ў Камітэт дзяржаўнай бяспекі СССР прыйшоў дзіўны ліст з горада Тулы.

«Даруйце, што не называю свайго прозвішча. Скажу па праўдзе — баюся. Я працую на будоўлі, і днямі ў нас адбылася аварыя: уначы ад моцнага ветру ўпаў кран якраз на бытоўку, дзе дзяжурыў мой стары сябар Буднік Пётр Пятровіч. Калі яго выцягнулі з-пад завалаў, ён ледзьве дыхаў. У бальніцы ўрачы шмат прыклалі сіл, каб яго выратаваць. Калі я прыйшоў праведаць, Пётр вельмі дрэнна выглядаў. Ён узяў мяне за руку і сказаў наступнае:

«Ты ведаеш, Мікола, у мяне няма ні сваякоў, ні сям'і. Ты мой адзіны сябар. На Беларусі, поблізу Гродна, ёсць вёска Лабна. Каля яе знаходзяцца рэшткі форта № 3. Паедзь туды, знайдзі адзінокі куст бэзу, вырві куст і знойдзеш заплечнік з золатам. Я так і не выбраўся па яго. Вазьмі частку сабе, астатняе перадай царкве, няхай мяне, грэшніка, памянуць добрым словам». Наступнага дня Пятро памёр. Не ведаю, гэта было трызненне ці праўда, але адкуль у яго, рабацягі, торба золата? А нават калі гэта і праўда, я ў такія гульні не гуляю. Таму і напісаў вам. А далей рабіце, што хочаце. Да пабачэння. Не, лепш бывайце!»

«Старшыні камітэта дзяржаўнай бяспекі т. Андропаву Ю. У. Па факце атрыманага ліста, рэг. нумар 54298, Гродзенскім абласным камітэтам дзяржаўнай бяспекі былі праведзены адпаведныя мерапрыемствы. У выніку следства было ўстаноўлена, што форт № 3 практычна ўвесь знішчаны ў час вайны. Ніякіх хадоў не было знойдзена. Кустамі бэзу зарасла практычна ўся навакольная мясцовасць, і ідэнтыфікаваць названае месца практычна немагчыма. Атрыманую інфармацыю пра схаванае золата калегі з Гродна лічаць не адпаведнай рэчаіснасці. Начальнік другога галоўнага ўпраўлення КДБ СССР Грыгарэнка Рыгор Фёдаравіч».

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении закрытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «МПОВТ», г. Минск, ул. Притыцкого, 62

Предмет аукциона
Месторасположение: г. Минск, ул. Кульман, 1/13

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
РТП РП-84 (сооружение специализированное энергетики)	200,9 кв. м	500/С-64969

Составные части и принадлежности: площадка, ограждение

Имущество, входящее в состав лота: кабельные линии 10 кВ (инв. № 35514 – 1988 г. в. 2010 м, инв. № 35515 – 1961 г. в. 180 м, инв. № 31306 – 1988 г. в. 2010 м, инв. № 800211 – 1961 г. в. 180 м), оборудование РУ-0,4 кВ (инв. № 50995); оборудование РУ-10кВ (инв. № 950995); силовой трансформатор ТМЗ-630/10 №5411, 1989 г. (инв. № 52113); силовой трансформатор ТМЗ-630/10 № 5413, 1989 г. (инв. № 52114)

Начальная цена лота с НДС 20 % – 324 720,00 бел. руб.

Сведения о земельном участке: общ. пл. **0,0857** га предоставлен на праве аренды сроком до 28.02.2056 для размещения объектов энергетики. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий связи и радиофикации, электрических сетей

Обременение: наличие субабонентов

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке

Участвовать в закрытом аукционе могут только те лица, которым направлено приглашение на участие

Порядок проведения закрытого аукциона, оформления участия приглашенных лиц в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 04.01.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 03.01.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ЗАО «Альфа-Банк», 220013 г. Минск, ул. Сурганова, 43-47, тел. +375 17 2176464
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Лот № 1 – недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/1

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Участок для ремонта горнодобывающей техники. Реконструкция участка для ремонта горнодобывающей техники под линию по приему, переработке и хранению выгорающих добавок по ул. Я. Мавра, 47 (корректировка) (здание обрабатывающей промышленности иного назначения)	749,9 кв. м	500/С-55013

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 515 577,00 белорусских рублей

Лот № 2 – недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/20

Административно-бытовой корпус цеха кирпича (здание административно-хозяйственное)	1 388 кв. м	500/С-27647

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 1 708 151,00 белорусских рублей

Лот № 3 – недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/2

Л 2/к Административно-бытовой корпус ремонтно-строительного цеха (здание специализированное для производства строительных материалов)	611 кв. м	500/С-30619

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 866 520,00 белорусских рублей

Лот № 4 – недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/16

Ремонтно-механический цех (здание специализированное для производства строительных материалов)	1 713 кв. м	500/С-25333

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 1 329 900,00 белорусских рублей

Сведения о земельном участке: общ. пл. 16,4942 га предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования (доля 613/20000) для эксплуатации и обслуживания административного и производственных зданий и сооружений завода.
Ограничения (обременения) прав: охранная зона водопровода, площадь 1,2273 га, 0,0800 га, 0,0696 га, 0,2046 га; охранная зона газопровода, площадь 0,5262 га, 0,0585 га, 0,0210 га

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата, время и место проведения электронных торгов: 09.01.2018 в 11.00 (первый лот), каждый следующий лот с интервалом 20 минут, на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: 08.01.2019 до 17.00

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by**

ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует об отмене антикварного аукциона, назначенного на 14.12.2018 (публикация извещения в газете «Звязда» от 13.11.2018 г.) **Тел.: +375 17-280-21-33; +375 44-704-92-06.**

УНП 191224638

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4

Предмет аукциона

Наименование	Габариты, материал	Общ. пл., год выпуска	Инвентарный номер
Лот № 1			
Торговый павильон (с охранной сигнализацией)	10*4*3 м; металл	40 кв. м 2010 г. в.	13001000003
Начальная цена с НДС 20 %	**5 924,28 бел. руб. (снижена на 20 %)**		
Лот № 2			
Торговый павильон (с охранной сигнализацией)	10*4*3 м; металл	40 кв. м 2011 г. в.	13001000005; 09040000082
Начальная цена с НДС 20 %	**8 705,60 бел. руб. (снижена на 20 %)**		
Лот № 3			
Торговый павильон (с охранной сигнализацией)	10*4*3 м; металл	40 кв. м 2011 г. в.	13001000008; 02941000038
Начальная цена с НДС 20 %	**7 091,94 бел. руб. (снижена на 20 %)**		
Лот № 4			
Торговый павильон (с охранной сигнализацией)	10*4*3 м; металл	40 кв. м 2010 г. в.	13002000004; 09040000002
Начальная цена с НДС 20 %	**5 856,43 бел. руб. (снижена на 20 %)**		

Место нахождения лотов	г. Бобруйск, Минское шоссе (автостоянка возле проходной СКГШ)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи	**5 (пять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.10.2018

Дата и время проведения аукциона	**17.12.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**13.12.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ЗАО «Альфа-Банк», 220013 г. Минск, ул. Сурганова, 43-47, тел. +37517 2176464
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов – недвижимое имущество по адресу: г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 1Ж

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инв. номер
Материальный склад (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). *(Склад разделен на четыре складских изолированных помещения)*	579,8 кв. м	200/С-69181

Составные части и принадлежности: разгрузочная рампа, проезжая часть

Сведения о земельном участке	общ. пл. 0,1632 га предоставлен Продавцу на праве аренды до 01.12.2019 г. для содержания и обслуживания объектов недвижимости

Начальная цена с учетом НДС 20 % – 74 304,00 белорусских рублей

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Условия оплаты: в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи (если иное не будет предусмотрено соглашением сторон)

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 27.10.2018 г.

Дата, время и место проведения электронных торгов: 20.12.2018 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: 18.12.2018 до 17.00

Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

В связи с утерей считать недействительными страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске № 2 серии ВВ № 6658232;

страховые сертификаты, удостоверяющих заключение договоров страхования «Зеленая карта» серии BY/12/ № 16369438 – 16369440, 17165130 – 17165131;

бланки квитанций о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ серии СВ №№ 0237682, 0583719, 2383685, 2383687, 2396136;

страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 1128826 – 1128828, 1128830 – 1128831, 1128834, 1128836 – 1128838, 1128840, 1128844, 1128847, 1181366, 1090319.

УНП 100706519

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 412/С-23336 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 126,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина

Лот № 1 расположен на земельных участках кадастровый номер 424050100015000123 (назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (эксплуатация и обслуживание строений)), площадью 0,0052 га, расположенном по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина и кадастровый номер 424050100015000137 (назначение – для обслуживания здания магазина), площадью 0,0121 га, расположенном по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина

Начальная цена продажи – 8 441 руб. (восемь тысяч четыреста сорок один рубль) с учетом НДС

Сумма задатка – 844 руб. (восемьсот сорок четыре рубля)

Продавец – Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 20 декабря 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.
Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.08.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 17 декабря 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторного аукциона

Лот № 1. Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 730/U-16808 – здание одноквартирного жилого дома, готовность – 54 %, по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Мельникова, д. 5.

Начальная цена продажи: 13 895,00 бел. рублей (с учетом понижения на 50 %).
Сумма задатка: 1 389,50 бел. руб.

Лот № 2. Капитальное строение с инв. № 730/С-12820 – здание заводоуправления площадью 2 935,2 кв. м по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А (со вспомогательными сооружениями).

Начальная цена продажи: 120 042,48 бел. рублей с учетом НДС (с учетом понижения на 80 %).
Сумма задатка: 12 004,25 бел. руб.

Лот № 3. Незавершенное законсервированное капитальное строение здание административно-хозяйственное с инв. № 730/U-15754 площадью 7458 кв. м по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1.

Начальная цена продажи: 480 057,88 бел. рублей с учетом НДС (с учетом понижения на 80 %).
Сумма задатка: 48 005,79 бел. руб.

Аукцион состоится 20 декабря 2018 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 19 декабря 2018 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для внесения задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Белшина», УНП 700016217, Могилевская обл., г. Бобруйск, Минское шоссе

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 14.04.2018, от 07.06.2018, от 11.07.2018, от 11.09.2018, 23.10.2018

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, + 375 29 624-26-25, +375 44 767-65-36

Экспертыза

КУЛЯ ВАЖЫЦЬ НЯШМАТ

ЯК СПЕЦЫЯЛІСТЫ ДАСЛЕДУЮЦЬ ЗБРОЮ?

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі няма вольнага абарачэння агнястрэльнай зброі, пісталеты, рэвальверы, даўгаствольныя стрэльбы перыядычна трапляюць на даследаванне да судовых экспертаў. Сумную «майку лідара» тут трымаюць справы, звязаныя з браканьерствам. Але які шлях праходзіць зброя падчас экспертызы? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» распытаў намесніка начальніка аддзела даследавання зброі цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Аляксея ПАШКЕВІЧА.

Рэха «маўзера»

У калекцыі экспертаў-балістаў ёсць унікальныя для Беларусі прадметы зброі. Адзін з самых рэдкіх экзэмпляраў — амерыканскі рэвальвер «Сміт-весан», які, як мяркуецца, быў зроблены ў 1875—1880 гадах. Зараз пабачыць гэтую зброю вагой паўтара кілаграма можна толькі ў вестэрнах. А апынуўся ён у калекцыі выпадкова. Дзесьці ў Мінску паступіла паведамленне па лініі 102, што ў адной з кватэр адбываецца вялікі сямейны скандал. Супакойваць мужа і жонку адправіўся мясцовы ўчастковы міліцыянер. Зайшоўшы ў кватэру, ён пабачыў рэвальвер. Папрасіў прад'явіць дакументы на яго, але неабходных папер у наяўнасці не аказалася.



Але гэта выпадак унікальны. Куды часцей да экспертаў паступаюць на разгляд вінтоўкі Мосіна і «Маўзер», наганы і маўзеры часоў Першай і Другой сусветных войнаў. Амаль усё гэта — рэха шматлікіх войнаў, якія каціліся ў першай палове мінулага стагоддзя праз Беларусь. Некаторыя экзэмпляры, дарэчы, прыносяць у заводскай змазцы. Праўда, датычыцца гэта болей нямецкай зброі. Падчас аперацыі «Баграціён» нацысты адступалі настолькі хутка, што не паспявалі вывозіць зброю з сабой. І закопвалі скрынкі з ёй у зямлю.

